© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

БАЦЬКАЎШЧЫНА

ОРГАН БЕЛАРУСКАЙ НАЦЫЯНАЛЬНА-ВЫЗВОЛЬНАЙ ДУМКІ

WHITERUTHENIAN NEWSPAPER "BACKAUSCYNA" ("FATHERLAND")
Authorized by EUCOM Hqs Civil Affairs Division, 1. January 1951, Nr. UNDP 225
Responsible Publisher: Wladimir BORTNIK
Printing Office: Buchdruckerei der Apostolischen Visitatur, München 8, Rosenheimer Straße 46a. — Telefon-Nr. 45 81 43
Post Adress: "Backauscyna", München 22, Herzog-Rudolf-Straße 49/III
Die Administration der Weißruthenischen Zeitung „BACKAUSCYNA"
München 22, Herzog-Rudolf-Straße 49/III

ГАЗЭТА ВЫХОДЗІЦЬ РАЗ У ТЫДЗЕНЬ — ЦАНА 30 Н. ФЭН.

DIE WEISSRUTHENISCHE ZEITUNG „DAS VATERLAND" | THE WHITERUTHENIAN NEWSPAPER „THE FATHERLAND" | LE JOURNAL BIELORUSSIEN „LA PATRIE"

№ 4 (83) Нядзеля, 27 студзеня 1952 г. ГОД ВЫДАНЬНЯ 6

Чаму не разумее нас Захад?

ПРАЗ РАСЕЙСКІЯ АКУЛЯРЫ

Адным з найбольш ненармальных і шкодных нам зьявішчаў у дачыненьні Захаду да падрасейскага, а цяпер падсавецкага Усходу ёсьць пагляд, што ўсе тыя тэрыторыі, якія ляжаць на ўсход ад Буга й Сану — гэта Расея, а ўсе тыя народы, што гэтую вялізарную тэрыторыю засяляюць, — гэта ў васнаўным расейцы. Праўда, кажны інтэлігентны чалавек Захаду ведае, што на тэрыторыі аднэй шостай жыве цэлая мазаіка розных народаў і плямёнаў, аднак ён не здае сабе дастаткова справы з таго, якая ступень іхнае апрычонасьці, якое іх гістарычнае мінулае, як яны апынуліся ў складзе расейскае імпэрыі, якія іх нацыянальныя імкненьні й палітычныя асьпірацыі, а галоўнае — на чым гэтыя імкненьні базуюцца.

Для шэрага заходняга інтэлігента, не гаворачы ўжо аб простай народнай масе — нерасейскія славянскія народы — беларусы, украінцы й казакі — гэта толькі адгалінеьні аднаго й таго самага народу расейскага, а народы неславянскія — гэта яшчэ першабытныя плямёны, перамешаныя з расейцамі, якія ня маюць ані гістарычнай традыцыі, ані выразных нацыянальных імкненьняў, а зьяўляюцца толькі этнаграфічнай масай, што знаходзіцца яшчэ на прымітыўным узроўні свайго разьвіцьця й незалежна ад Расеі існаваць ня можа. Для такога роду заходніх ляікаў, — а іх бальшыня навет сярод інтэлігенцыі — грузін або туркестанец у сваей нацыянальнай дасьпеласьці й гістарычнай традыцыі нічым ня розьніцца ад якута або чэраміса.

Паўстае тады пытаньне, дзе фактычна хаваецца прычына такога хвальшывага пагляду й няведаньня ўзапраўдных нацыянальных дачыненьняў на ўсходзе Эўропы й у падсавецкай Азыі, дзе прычына такой ігнаранцыі й замарочаньня паняцьцяў у паглядах на ўсходнюю праблему? Бо ў той час, калі гэты-ж шэры заходні інтэлігент больш менш здае сабе справу з нацыянальных дачыненьняў усім прымітыўных каляровых народаў Афрыкі ці паўдзённа-ўсходняй Азыі, ён зьяўляецца поўным анальфабэтам у сваіх паглядах на такія народы, як беларусы, украінцы, туркестанцы ці каўкасцы, якія маюць куды багацейшую гістарычную мінуўшчыню за расейцаў, а сяньняшняя культурная ўзроўня якіх зусім ня ніжэйшая, чымсьці ў расейцаў, якія ў дадатак зьяўляюцца ягонымі непалёкімі суседзямі.

Калі заходні сьвет выказвае такую незнаёмасьць сяньняшніх падсавецкіх народаў, то ўжо аб іхных нацыянальна-вызвольных імкненьнях, як і аб рэальнасьці й мэтазгоднасьці гэтых імкненьняў ён арыентуецца яшчэ менш. У ўяўленьні людзей Захаду Расея — гэта нешта на столькі суцэльнае й арганічна зьвязанае, што ейны распадзел на нацыянальныя дзяржавы выдасцца нечым нерэальным, не мэтазгодным, а навет — праступным. У той час, калі гэтыя людзі ўспрыймаюць распадзел брытанскае імпэрыі й унезалежненьне ейных калёніяў, як нешта зусім натуральнае й гістарычна неабходнае, яны ніяк ня могуць пагадзіцца з думкай, што падобны лёс павінен спаткаць таксама й Расею. Таму да нацыянальна-вызвольных рухаў нерасейскіх народаў ставіцца Захад недаверліва, вычэкваюча, а ў найлепшым выпадку — абыякава.

«АДЗІНАНЕДЗЯЛІМАЎСКАЯ» ПАЛІТЫКА ЗАХАДУ

Ёсьць дзьве аснаўныя прычыны такой заблытанасьці паняцьцяў у дачыненьні да ўсходняй праблемы: адна, калі так можна выразіцца, нутраная, а другая — вонкавая, якая зьяўляецца непасрэдным вынікам замежнай палітыкі заходніх дзяржаваў у дачыненьні да Расеі. Захад, а ў тым ліку й ЗША, доўгі час уважалі, што для раўнавагі сілаў у сьвеце ім патрэбная вялікая й сільная Расея, якая балянсавала-б дзьве магутныя дынамічныя дзяржавы — Нямеччыну з захаду й Японію — з усходу. Да гэтага далучаўся мамэнт эканамічны — вялікая й індустрыяльна адсталая Расея ўважалася за выгадны рынак збыту, на які Захад мог кідаць надвыжку сваей прамысловай прадукцыі й адкуль мог даставаць патрэбную яму сыравіну. Заходнія дзяржавы ўважалі, што куды выгадней мець гандлёвыя інтарэсы з адным вялікім клієнтам, чымсьці з цэлым радам клієнтаў дробных.

Выходзячы з гэтых, чыста практычных, мяркаваньняў, заходняя палітыка аж да апошняга часу разьвівалася ў кірунку захаваньня вялікай Расеі, а таму ня толькі ня была яна зацікаўленая ў паддзержываньні незалежніцкіх рухаў нерасейскіх народаў, але наадварот, гэтыя рухі былі ей не па руку, а таму й не знаходзілі яны па Захадзе ніякай сымпатыі. Ясна, што такая палітыка Захаду зрабіла сваё: яна на працягу доўгіх дзесяцігодзьдзяў сыстэматычна ўзьдзейвала на заходнія грамадзянствы й адпаведна фармавала іхную апінію аб нацыянальнай праблеме Ўсходу.

Але сяньня палажэньне дыямэтральна зьмянілася. Сяньня ані Нямеччына, ані Японія ня толькі Захаду загражаць ня могуць, але навет становяцца ягонымі саюзьнікамі. Затое сяньняшняя Расея ў форме Савецкага Саюзу, якая культывуе й да высокай ступені ўдасканальвае імпэрыялістычную палітыку царскае Расеі, сталася сьмяротнай загрозай для Захаду.

Наіўным ёсьць таксама пагляд, які яшчэ пакутуе ў многіх уплывовых заходніх сфэрах, што будучая «дэмакратычная» Расея, якая паўстане пасьля зьнішчэньня бальшавізму, вызбудзецца дасюлешніх імпэрыялістычных імкненьняў і станецца карысным сябрам у сям'і дэмакратычных дзяржаваў сьвету. Тыя, што гэтак думаюць, забываюцца, на жаль, што дынамічны імпэрыялізм, няўпыннае імкненьне да пашырэньня сваіх тэрыторыяў коштам іншых народаў, зьяўляецца неадлучнай рысай псыхалёгіі расейскага народу, якая зьяўляецца найважнейшым рухаючым маторам расейскае гісторыі ўжо ад XV стагодзьдзя. Гэтая рыса найяскравей сяньня выяўляецца ў савецкіх агрэсыўных плянах з аднаго боку й палітычнай пляцформе даслоўна ўсіх расейскіх палітычных групаў на эміграцыі — з другога. Таму няма абсалютна ніякай гарантыі, што будучая Расея з драпежнага ваўка раптам станецца нявінным ягняткам, затое ёсьць шмат дадзеных на тое, што гэты драпежны воўк і надалей астанецца тым самым ваўком.

Захад яшчэ ня змог зразумець, што захаваньне ў будучыні вялікай і сільнай, хоць і не бальшавіцкай Расеі можа для яго быць больш небясьпечным, чымсьці адроджаныя нямецкі й японскі імпэрыялізмы ўзятыя разам. Аб адраджэньні імпэрыялізму гэтых апошніх дзяржаваў да трэйцяй сусьветнай вайны ня можа быць і мовы, бо ў гэтым пэрыядзе часу абедзьве гэтыя дзяржавы будуць знаходзіцца пад непасрэднай кантроляй Захаду, у першую чаргу — ЗША. Але ў выпадку пераможнай новай сусьветнай вайны, як Нямеччына, гэтак і Японія, якія ў вайне такой прыймуць актыўны ўдзел, як раўнапраўныя парт-

(Заканчэньне на 3 балоне)

За падтрыманьне супрацьбальшавіцкіх рухаў у СССР

У папярэднім нумары «Бацькаўшчыны» мы ў перадавым артыкуле «Ад словаў да чыну» зьвярнулі ўвагу на значэньне пастановы амэрыканскага кангрэсу, на моцы якой прызнана 100 мільёнаў даляраў на падтрыманьне й рэнабудову супраць бальшавіцкіх падпольных рухаў за зялезнай заслонай. Сяньня можам падаць рад канкрэтных дадзеных аб гэтай пастанове кангрэсу ЗША, якія бяром зь перадавога артыкулу швайцарскай газэты «Ді Тат» за 27 сьнежаня 1951 г. («Ці Вашынгтон падтрымлівае проціўсавецкія падпольныя рухі?») і з артыкулу Р. Ільніцкага («Амэрыканскі закон пра ўзаемную дапамогу» — «Украінскі Самостыйнік» за 27. 1. 1952 г.), які ў сваю чаргу апіраецца на інфармацыях амэрыканскага карэспандэнта гэтае газэты сп. Н. Олежко.

Гэты закон называецца «Законам пра ўзаемную бясьпечнасьць», які быў прыняты кангрэсам 10 кастрычніка мінулага году. Прывядзём артыкул 101 А (1) гэтага закону, які датычыць парушанага тут намі пытаньня:

«Дазваляецца выдзяліць 100 мільёнаў даляраў з агульнага крэдыту 5028 мільёнаў даляраў у карысьць некаторых асобаў, што прабываюць у СССР або Польшчы, Чэхаславаччыне, Мадзяршчыне, Румыніі, Баўгарыі, Альбаніі, Летуве, Латвіі, Эстоніі, або ў камуністычных зонах Нямеччыны й Аўстрыі, або ўцяклі з гэтых краінаў (а так-жа ў карысьць іншых падобных асобаў зь якой-небудзь іншай краіны, занятай Савецкім Саюзам). Мэтаю дапамогі ёсьць або стварэньне з гэтых асобаў вайсковых адзінак для падтрыманьня Паўночнаатлянтычнага пакту, або ўжыць гэтыя грошы для іншых мэтаў, калі прэзыдэнт дзяржавы вырашыць, што гэтае падтрыманьне прынясе карысьць для абароны Паўночнаатлянтычнай зоны або для бясьпечнасьці Задзіночаных Штатаў Амэрыкі».

«Закон пра ўзаемную бясьпечнасьць», як і кажны падобны закон, ставіць справу агульна й рамова. Зь яго нельга дакладна даведацца, ці вайсковыя адзелы паняволеных бальшавізмам народаў маюць тварыцца толькі на Захадзе з уцекачоў з за зялезнай заслоны, ці таксама маюць разбудоўвацца партызанскія рухі на падсавецкай тэрыторыі, а таксама ці дапамогай мае быць абнятая толькі вайсковая акцыя, ці таксама ўсякая іншая дзейнасьць паняволеных народаў, накіраваная на зьнішчэньне бальшавізму. Словы закону, што «або ўжыць гэтыя грошы для іншых мэтаў, калі прэзыдэнт дзяржавы вырашыць, што гэтае падтрыманьне прынясе карысьць для абароны Паўночнаатлянтычнай зоны або для бясьпечнасьці Задзіночаных Штатаў Амэрыкі», гавораць нядвузначна, што заплянаваная супраць бальшавіцкая акцыя будзе мець шырэйшы маштаб.

Значна болей сьвятла кідае на гэтую справу дыскусыя й высказваньні над законам як у кангрэсе, гэтак і паза кангрэсам.

Аўтарам гэтага закону зьяўляецца кангрэсмэн із штату Віскансін **Чарльз Кэрстэн,** гарачы прыхільнік распадзелу расейаке імпэрыі на нацыянальныя дзяржавы паняволеных народаў, у тым ліку й народу беларускага. Сваё палітычнае кредо ў дачыненьні да ўсходняй праблемы ён задакумэнтаваў у зложаным ім 17 красавіка 1951 г. у кангрэс праекце рэзалюцыі, каб кангрэс пацьвердзіў сваю прыязьнь да паняволеных украінцаў, беларусаў, грузінаў, балтыйскіх і іншых паняволеных народаў і выказаў непахіснае становішча, што ўсе гэтыя народы «маюць права на самавызначэньне, уключна з правам кажнай нацыі ўстанаўляць собскія формы ўраду».

«Закон пра ўзаемную бясьпечнасьць», прыняты 10 кастрычніка м. г., прыгатаўляўся ў амэрыканскіх законадаўчых палатах чатыры месяцы, падчас якіх вяліся абшырныя на гэтую тэму дыскусыі ў паасобных камісыях і на пленумах кангрэсу й сэнату. Сам аўтар закону Ч. Кэрстэн гэтак аб ім высказваўся: «Мы павінны дапамагчы ў арганізацыі вайсковых адзінак палітычных уцекачоў із за зялезнай заслоны. Вайсковыя аддзелы павінны фармавацца на падставе нацыянальнага прынцыпу з тым, каб іх уключыць у эўрапэйскую армію (пратакол з 25 ліпеня м. г.) . . .» І далей: «Я думаю, што вынік нашых высілкаў быў-бы шмат лепшы, калі-б гэтыя людзі ўваходзілі ў склад собскіх нацыянальных аддзелаў . . . Далёка сягаючае значэньне нашага пляну палягае на тым, што ён ударыў-бы, як маланка, па «зялезнай заслоне . . .»

«Сам Кэрстэн — піша «Ді Тат» — ніколі не рабіў тайніцы, што да запраўднага значэньня гэтага пункту закону. 17 жнівеня падчас абгаварваньня закону ён заявіў у палаце рэпрэзэнтантаў: «Мая папраўка да закону бярэ пад увагу магчымасьць дапамагчы тым падпольным арганізацыям, якія цяпер існуюць і якія паўстануць яшчэ ў будучыні».

19 ліпеня 1951 г. на закрытым паседжаньні камісыі замежных справаў заступнік дзяржаўнага сакратара ЗША **Адольф Бэрлі** заявіў, што тут расходзіцца пра арганізацыю паўстаньня ў краінах «зялезнай заслоны» й пра выкарыстаньне для гэтае мэты супраць рэжымных групаў.

І далей чытаем у газэце «Ді Тат»: «Калі ставіць пытаньне канкрэтна, ці ўрад ЗША зрабіў нешта дагэтуль, каб спрыяць супрацьсавецкім рухам у сярэдзіне й вонках СССР або каб фінансаваць іх, **то на падставе досыць дакладных вестак трэба сказаць: вельмі мала.** Праўда, якраз цяпер у Вашынгтоне рэарганізуецца «Рада псыхалягічнай стратэгіі», і ейны новы шэф Раймонд Ален, магчыма, зможа зрабіць больш, чымсьці ягоны папярэднік Гордон Грэй. Але самым толькі плачэньнем **рахункаў «Радыя Вольнай Эўропы» й некаторых радыяперадачаў «Голасу Амэрыкі»,** фінансавым падтрыманьнем **нешчасьлівага прадпрыемства Керэнскага** й прадукаваньнем лістовак нічога ня будзе здабыта.

Астаецца факт, што амэрыканская палітыка зусім яшчэ не адважылася ў запраўднасьці больш выразна дапамагчы супрацьсавецкім сілам у сярэдзіне й вонках усходняга блёку. Хаця ня мала галасоў, якія гэтага дамагаюцца. Да іх належыць ген. **Люцыюс Клей,** адзін з шэфаў «Крыжовага Паходу Свабоды», далей **Гэрольд Стасэн,** якога праграма што да Расеі супярэчыць у сваей аснове праграме Джорджа Кэнэна таму, што Стасэн дамагаецца ясна й нядвузначна вызваленьня нерасейскіх народаў СССР. Да іх належыць таксама сэнатар **Робэрт Тафт,** які якраз некалькі дзён таму ў дакладзе ў унівэрсытэце Паўночнай Караліны заявіў, што за зялезнай заслонай мусіць быць створаны заходні падпольны рух, бо гэта адзіны шлях выйграць халодную вайну, і напасьледак — **Джон Фостэр Далес,** які 27 лістапада ў Дэтройце выразна вымагаў палітычнага проціўнаступу супраць Савецкага Саюзу, які меў-бы арыентавацца на паняволеныя народы савецкай клеткі . . .»

І яшчэ чытаем: «Адно ёсьць пэўным: спадзяваньні мільёнаў уцекачоў з Усходняй Эўропы й балтыйскіх краін, — якія таму, што любяць свабоду больш за няволю, сяньня часта знаходзяцца ў жалюгодных умовах у Заходняй Эўропе, Канадзе, Амэрыцы й Аўстраліі — узрастаюць асабліва ў сувязі з пунктам 101 А (1) «Закону пра ўзаемную бясьпечнасьць», у якім яны бачаць выходны пункт для сваей вызвольнай палітыкі. Такая палітыка ёсьць зьмястоўнейшая, прынамсі ў будучыні, чымсьці нэгатыўная «палітыка паўстрыманьня», якая пакуль што на дзеле пануе ў Вашынгтоне».

Бачым тады, што амэрыканскі «Закон пра ўзаемную бясьпечнасьць» мае мець шырокае застасаваньне й будзе абыймаць супрацьсавецкую вайсковую й ўсякую іншую дзейнасьць па абодвых бакох зялезнай заслоны. **Гэта абазначала-б, што ў амэрыканскай палітыцы ў**

(Заканчэньне на 2 балоне)

Турэччына бароніць Беларусь

На нядаўнім сабраньні Рады Эўропы ў Штрасбургу турэцкі дэлегат З. Эбузія высунуў дамаганьне, каб спэцыяльная камісыя, што займаецца пытаньнем абароны народаў з паза зялезнай заслоны, узяла пад увагу інтарэсы Беларусі, Украіны й Паўночнага Каўказу.

Зьвярнуўшы ўвагу на тое, што Рада Эўропы запраектавала дапамогу балтыйскім народам, ён даказваў, што Беларусь, Украіна й Паўночны Каўказ сваім праўным палажэньнем ня розьняцца ад балтыйскіх краінаў і што ў гэтай справе ня можа быць ніякіх палітычных упярэджаньняў, якія выяўляюцца ў страху даць пажыву для савецкай прапаганды.

Ангелец Біміш, як старшыня камісыі, заявіў, што камісыя бярэ пад увагу ўсе дамаганьні турэцкага дэлегата.

(«Укр. Думка»)

За навучаньне роднае мовы

Вельмі важным нацыянальным заданьнем нашае эміграцыі есьць усьцерагчы нашае маладое пакаленьне ад асыміляцыі ня толькі нацыянальнай, але й псыхалягічнай. А такая асыміляцыя дзецям нашых суродзічаў у сяньняшніх умовах іхнага жыцьця моцна загражае.

Значна іншыя былі умовы ў ДП-лягерах Нямеччыны. Тады ўсюды там, дзе нашыя суродзічы жылі большымі зарганізаванымі групамі, працавалі беларускія школы, якія, апрача навучаньня, адыгрывалі важную ролю нацыянальнага узгадаваньня. Вынікі узгадавальнай дзейнасьці гэтых школаў не паішлі на марна: дзеці, што іх наведвалі, захавалі у сабе глыбокую любоў да усяго беларускага, да сваей далекай паняволенай Бацькаўшчыны, якой яны ў бальшыні выпадкаў ужо ня помняць. Узоўджанае у іх дзякуючы роднай школе гарачае пачуцьцё да Бацькаўшчыны, пэўне-ж, ужо не замрэ й оўдзе зарукай, што й у будучыні гэтая моладзь, прынамсі больш ідэйная еиная частка, астанецца нацыянальна сьведамай.

У зусім іншых умовах знаходзіцца нашае падрастаючае пакаленьне пасьля выэміграваньня зь Нямеччыны ў краіны новага пасяленьня. Ува ўсіх гэтых краінах, з прычыны вялікай расьцярушанасьці, ня можа быць і мовы ад там, как нашыя дзеці ў Амэрыцы, Канадзе ці Аўстраліі маглі мець свае беларускія школы. Яны наведваюць там школы чужыя, у якіх ня толькі здаюваюць веду у чужой для іх мове, але таксама знаходзяцца пад сталым узьдзеиваньнем чужанацыянальнага ўзгадаваньня.

Знаходзячыся ў такіх абставінах, дзе няма беларускага нацыянальнага ўзгадаваньня, нашыя дзеці легка падпадаюць пад узьдзейваньне асыміляцыйнага працэсу — у першую чаргу асыміляцыі псыхалягічнай. Поўная нацыянальная асыміляцыя для першага эміграцыйнага пакаленьня яшчэ так моцна не загражае. Нашыя дзеці, знаходзячыся ў беларускіх сем'ях, дзе гаворацъ толькі паабеларуску й адчуваюць сваю беларускую нацыянальную прыналежнасьць, яшчэ не забудуцца роднае мовы й не перастануць называць сябе беларусамі. Але будучы пазбаўленымі сыстэматычнага нацыянальнага ўзгадаваньня й знаходзячыся пад сталым узьдзейваньнем узгадаваньня чужога, могуць лёгка засыміляваца псыхалягічна — зрабіцца абыякавымі ў сэнсе нацыянальна-беларускім, вызбыцца беларускага патрыятызму, стацца беларусамі толькі навонкі, а ўнутры амэрыканцамі, канадыйцамі ці аўстралійцамі, тым больш, што, ня ў прыклад сваіх бацькоў, яны ўжо дасканала апануюць мову сваей новай бацькаўшчыны й увойдуць у ейнае культурнае жыцьцё.

Таму вельмі важным нацыянальным абавязкам усіх беларускіх бацькоў і матак ёсьць арганізаваць дома прыватнае навучаньне сваіх дзяцей роднае мовы й знаёміць іх зь іхнай запраўднай Бацькаўшчынай — зь ейнай гісторыяй, літаратурай, геаграфіяй і наагуль з жыцьцём беларускага народу. Такога роду праца будзе лёгкай і ўдзячнай. Вынікі-ж яе будуць бясспрэчна вялікія пад умовай, што яна будзе праводзіцца сыстэматычна.

Вялікаю цяжкасьцю ў арганізацыі такога дамашняга навучаньня й узгадавальнай дзейнасьці будзе, бясспрэчна, адсутнасьць дастатковай колькасьці адпаведнай дзіцячай літаратуры. Але й гэтыя цяжкасьці пры добрай волі часткова перамагчы можна. Трэба на пачатку карыстацца тым, што ёсьць, можна таксама знаходзіць і на балонах нашае прэсы некаторыя творы, што могуць узбудзіць зацікаўленьне дзяцей, прыкладам, паэма «Новая Зямля», што цяпер друкуецца на балонах «Бацькаўшчыны».

Але гэта толькі на першы пачатак. У далейшым паўстае неабходная патрэба сыстэматычнага выдаваньня адумысловага часапісу для дзяцей. Нашыя пэдагогі павінны ўзяцца за рэдагаваньне такога часапісу безадкладна, паэты й пісьменьнікі прыйсьці з помаччу ў забясьпечваньні рэдакцыі мастацкімі патрыятычнымі творамі для дзяцей, а пра фінансавую базу для такога выдавецтва

(Заканчэньне на 2 балоне)

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

Прычыны й вынікі развалу СОНР-у

У папярэднім нумары «Бацькаўшчыны» мы перадрукавалі артыкул з амэрыканскай газэты «New York Herald Tribune», у якім паведамляецца, што зь пяці расейскіх палітычных партыяў, якія прыступілі да стварэньня г. зв. Савету Вызваленьня Народаў Расеі (СОНР), дзьве зь іх — партыя Керэнскага й партыя Мельгунова — выйшлі із СОНР-у и што, дзякуючы гэтаму, СОНР фактычна перастаў існаваць. Некалькі дзён пазьней прэса падала да ведама, што й НТС (расейскія салідарыстыя) — найсільнейшая, побач із Саюзам Змаганьня за Вызваленьне Народаў Расеі — расейская палітычная партыя, збудаваная на нацыяналістычна-фашыстоўскіх прынцыпах, таксама пакінула СОНР. Адначасна тая-ж прэса паведаміла, што и г. зв. Бюро па Скліканьні СОНР-у, што знаходзілася ў Мюнхэне й складалася з прадстаўнікоў пяці расейскіх партыяў, таксама разьвязалася, бо Амэрыканскі Камітэт Вызваленьня Народаў Расеі перастаў яго фінансаваць. Значыцца канчальны развал СОНР-у стаўся ўжо дакананым фактам.

Як згодна падае расейская, нямецкая й замежная прэса, прычынай развалу СОНР-у, які, да рэчы, знаходзіўся яшчэ ў стадыі арганізацыі, былі вострыя разьбежнасьці у нацыянальным пытаньні. Нацыянальна-палітычныя прадстаўніцтвы нерасейскіх народаў, як перадумову супрацоўніцтва з расейцамі на базе СОНР-у, запатрабавалі згоды апошніх на раўнапраўнасьць кажнай нацыянальнасьці на базе СОНР-у й вызнаньня бясспрэчнага права кажнага народу на аднаўленьне пасьля зьнішчэньня бальшавізму ягонай дзяржаўнай незалежнасьці, абвешчанай у 1917-18 г.г. Расейскія-ж палітычныя групы на такую пастаноўку справы не згадзіліся, найстойваючы на будучай фэдэрацыі з Расеяй усіх народаў Савецкага Саюзу, робячы толькі тую ўступку, што яны дапусьцілі магчымасьць народнага волявыяўленьня-плебісцыту аб тым, ці паасобныя нерасейскія народы захочаць аддзяліцца ад Расеі й стварыць свае незалежныя дзяржавы, ці астацца и надалей у ейным складзе. Прызнаць дакананага ўжо факту — абвешчаньня гэтымі народамі сваіх незалежных дзяржаваў у 1917-18 г.г., расейцы катэгарычна адмовіліся. Вось-жа гэтыя разыходжаньні й былі тэй скалай, аб якую разьбіўся СОНР.

Такім чынам сталася тое, што мы ў сваіх папярэдніх артыкулах, прысьвечаных гэтаму пытаньню, прадбачылі: што СОНР ня можа быць створаны на тэй нацыянальнай базе, на якой ягонае тварэньне было распачатае. Гэтая база была хвальшывая: яна ня толькі давала расейцам вельмі ўпрывілеяванае становішча коштам нацыянальных інтарэсаў і правоў нерасейскіх народаў, што ўжо было грубым нарушэньнем дэмакратычнага прынцыпу раўнапраўнасьці, але навет замацоўвала й узаконьвала імпэрыялістычныя пасяганьні расейцаў на сувэрэннасьць нерасейскіх народаў. Дык ясна, што нацыянальна-палітычныя прадстаўніцтвы нерасейскіх народаў на такую самабойчую канцэпцыю згадзіцца не маглі.

Але ня толькі гэта прывяло да развалу СОНР-у. Як аказалася, згода расейцаў на дзяржаўную незалежнасьць нерасейскіх народаў шляхам народнага волявыяўленьня-плебісцыту, да рэчы, выгаднага для іх у ўмовах, створаных бальшавікамі на нерасейскіх тэрыторыях, была толькі няшчырым тактычным ходам, прыкрым, але неабходным кампрамісам, які быў імі зроблены пад націскам Амэрыканскага Камітэту. Але калі было патрэбным зрабіць далейшы крок і нешта зрабіць больш канкрэтнае на пацьверджаньне сваіх словаў аб самавызначэньні народаў, расейскія адзінанедзялімаўцы не маглі ўжо йграць хвальшывай ролі й збунтаваліся.

Найцяжэй было Амэрыканскаму Камітэту ўцягнуць у СОНР расейскіх нацыянал-фашыстых з пад знаку НТС. Із за войстрай апазыцыі гэтай групы ў справе нацыянальнага пытаньня сарвалася год таму Фюсэнская канфэрэнцыя. Яны тады ў сваім воргане «Посев» паведамілі, што ня хочуць быць удзельнікамі «разьдзелу Расеі», што не жадаюць сабе йсьці «па сьлядох мёртвага Розэнбэрга». Аднак пазьней, відаць пад уплывам амэрыканскіх даляраў, зьмянілі на 180 градусаў сваю тактыку й падпісаліся пад нацыянальнай дэклярацыяй СОНР-у ў Штутгарце й Вісбадэне. Трохі пазьней іхнае расейскае шавіністычнае сумленьне ўзяло такі верх: — НТС адмовіўся ад сваіх ранейшых подпісаў і пакінуў СОНР.

Падобна было з другой расейскай імпэрыялістычнай арганізацыяй — Саюзам Змаганьня за Свабоду Расеі Мельгунова. Гэтая арганізацыя таксама зраклася сваіх подпісаў, паложаных ею ў Фюсэне, Штутгарце й Вісбадэне пад дэклярацыяй у нацыянальным пытаньні, і таксама пакінула СОНР. Мельгуноў у сваім воргане «Русский Демократ» (№ 2) паддаў войстрай самакрытыцы ўсе свае ранейшыя паступкі, гаворачы ў артыкуле «Разьбітыя ілюзыі», што ён «жорстка памыліўся». А ягоны супрацоўнік М. Хераскаў, што ў № 1 «Русского Демократа» захопліваўся, што «пачын у стварэньні Савету Вызваленьня Народаў Расеі ёсьць трыумфам здаровага розуму», а цяпер вызнае ўжо поўны правал гэтага трыумфу й самога СОНР-у.

Але найбольшую непасьлядоўнасьць выявіў сам Керэнскі — цэнтральная фігура ў акцыі мантаваньня СОНР-у. У ньюёрскім «Новым Русским Слове» за 30. 12. 51 г. ён памясьціў ліст у рэдакцыю «Што адбылося ў Вісбадэне й Мюнхэне». У гэтым лісьце нападае ўжо Керэнскі на Амэрыканскі Камітэт, што ён падпаў пад уплыў «сэпаратыстых», што «дзякуючы няўзгодненаму паступаньню нашага Бюра й сп. Дон-Левіна сярод запрошаных у Вісбадэн прадстаўнікоў нацыянальных арганізацыяў выявіліся й захапілі вядучую ролю цьвёрдыя «предрешенцы-сепаратисты», якія мелі сьмеласьць заявіць, што яны запрошаныя непасрэдна Амэрыканскім Камітэтам, што Штутгарцкія пастановы, у якіх яны ня прыймалі ўдзелу, іх не забавязваюць, і паставілі наступныя дамаганьні: 1. вызнаць аўтаматычна незалежнасьць тых народаў, што існавалі, як дзяржавы, пасьля 25 кастрычніка 1917 г. і былі пазьней акупаваныя Расеяй, 2. вызнаць за сувэрэнныя ворганы для кажнага народу ягоныя ўстаўныя сабраньні й адмовіцца ад усерасейскага ўстаўнога сабраньня, 3. пакінуць уважаць нерасейскія народы за народы Расеі й адпаведна гэтаму зьмяніць назву СОНР-у, 4. вызнаць раўнапраўнае партнэрства усіх нацыянальнасьцяў у СОНР-ы, адкінуўшы маерытэт расейцаў.

Сп. Дон-Левін ад імя Амэрыканскага Камітэту ня вызнаў у далейшым паўнамоцтваў г. зв. Бюра па скліканьні СОНР-у й загразіў склікаць новы зьезд, які меў-бы «дзелавы й прадуктыўны характар». Вось-жа Керэнскі у заканчэньні свайго лісту ад імя расейцаў адмовіўся ад далейшага ўдзелу ў гэтай справе, заяўляючы: «толькі на гэтым зьезьдзе, я пэўны, ня будзе расейскіх людзей, якім дарагія добрае імя й чэсьць Расеі».

Усе гэтыя высказваньні трох расейскіх партыяў, як і прычыны іхнага выхаду з СОНР-у гавораць самі за сябе й ніякіх камэнтараў не патрабуюць. Яны паказваюць, што расейцы ў сваім імпэрыялістычным шале ня толькі не пайшлі на спатканьне справядлівым дамаганьням нерасейскіх народаў, ня толькі не прабавалі дасягнуць якогась кампрамісу, але навет адмовіліся ад сваей собскай дэклярацыі ў нацыянальным пытаньні, якую яны самі апрацавалі, у Штутгарце й Вісбадэне падпісалі й якую запрапанавалі прыняць прадстаўніцтвам нерасейскіх народаў, як базу дзеля супрацоўніцтва зь імі.

Цяпер, прынамсі, павінна быць ясным для амэрыканцаў, — для нас гэта ясным было дауно — што расейскія эміграцыйныя палітыкі навет і ня думаюць сходзіць із сваіх імпэрыялістычных пазыцыяў, што для іх захаваньне ў будучыні «единой и неделимой» ёсьць справай куды важнейшай, чымсьці змаганьне й перамога над бальшавізмам, што сказаныя Керэнскім яшчэ ў 1945 г. словы — «Лепей дрэнны дыктатар (г. зн. Сталін — А. К.), чымсьці рваць на кускі жывое цела Расеі», для расейскіх эміграцыйных палітыкаў яшчэ й сяньня зьяўляюцца абавязваючай догмай.

Вось-жа ў пацьверджаньні самымі расейцамі гэтага факту й заключаецца той адзіны пазытыўны мамэнт, які выявіўся ў няўдачы стварэньня супольнага фронту змаганьня з бальшавізмам.

Другім важным пазытыўным мамэнтам ёсьць выясьненьне становішча тых амэрыканскіх палітычных колаў, што былі фактычнымі ініцыятарамі СОНР-у й успамагалі яго фінансава — Амэрыканскага Камітэту Вызваленьня Народаў Расеі.

Мы ўжо пісалі перад гэтым, што паколькі прадстаўніцтвы нерасейскіх народаў запрапанаванай расейцамі нацыянальнай праграмы СОНР-у прыняць ня могуць, астаюцца тады для амэрыканцаў дзьве магчымасьці: або пакінуць СОНР і тварыць іншы супольны фронт змаганьня з бальшавізмам на справядлівай нацыянальнай базе, якую маглі-б прыняць усе народы, або, на ўзор Уласаўскай практыкі, стварыць фікцыйныя арганізацыі нерасейскіх народаў зь людзей зусім прыпадковых і безадказных і, назваўшы іх нацыянальнымі прадстаўніцтвамі, увесьці ў СОНР.

Праўда, быў паложаны пачатак тварэньня такіх палітычных фікцыяў у сувязі з СОНР-ам. Мы сяньня аднак ня ведаем, ці ініцыятыва фабрыкаваньня такіх фікцыйных арганізацыяў паходзіла ад Амэрыканскага Камітэту ці толькі ад расейцаў. Незалежна ад усяго гэтага сяньня ўжо заіснаваў факт, што Амэрыканскі Камітэт па сьлізкай Уласаўскай дарозе аднак не пайшоў.

Ува ўсей гэтай справе нашае беларускае становішча ўжо скрышталізаванае. Мы із свайго боку заўсёды ўважалі й уважаем сяньня, што ўжо насьпела патрэба стварэньня супольнага каардынацыйнага цэнтру змаганьня з бальшавізмам. Мы таксама ўважаем, што сябрамі такога цэнтру павінны быць і расейцы — прадстаўнікі народу, які становіць адну трэйцюю частку насельніцтва Савецкага Саюзу й удзельная вага якога ў антыбальшавіцкім змаганьні можа быць вялікая. Нам хочацца таксама верыць, што знойдуцца на эміграцыі такія расейскія палітычныя аўтарытэтныя групы, у якіх палітычны розум і сьвядомасьць запраўдных інтарэсаў расейскага народу возьмуць верх над вузкім нацыяналізмам і аджыўшым свой век імпэрыялістычным мітам адзінай і непадзельнай Расеі.

Што-ж тычыцца нерасейскіх народаў, дык іхныя запраўдныя й аўтарытэтныя прадстаўніцтвы толькі ў такім антыбальшавіцкім цэнтры прымуць удзел, які будзе пабудаваны на базе поўнай раўнапраўнасьці ўсіх нацыянальнасьцяў-сяброў цэнтру й бясспрэчнага вызнаньня іхнага права на дзяржаўную незалежнасьць бязь ніякіх плебісцытаў, але на аснове ўжо дакананых фактаў — абвешчаньня й аднаўленьня імі іхных собскіх незалежных дзяржаваў пасьля першае сусьветнае вайны.

Гэтыя прынцыпы й павінны быць паложаныя ў васнову новае міжнацыянальнае антыкамуністычнае арганізацыі, якая, — як паведамляе тая-ж амэрыканская прэса — мае быць створаная на месцы СОНР-у.

Алесь Крыга

За падтыманьне супрацьбальшавіцкіх рухаў у СССР

(Заканчэньне)

дачыненьні да ўсходняй праблемы наступіла грунтоўная зьмена, што Амэрыка ад дасюлешняй палітыкі «контэйнмэнту» (паўстрыманьня бальшавіцкага наступу паза межамі цяперашняй сфэры ўплываў СССР), аўтарам якой быў кандыдат на амбасадара ЗША у Маскве Джордж Кэнэн, пераходзіць да палітыкі супрацьнаступу, да арганізаваньня падрыўной антысавецкай дзейнасьці на тэтыторыі самога СССР.

Дык і ня дзіва, што Крэмль гэтай зьменай амэрыканскай палітыкі перапалохаўся не на жарты. Ужо 21. 11. 51 г. Вышынскі злажыў генэральнаму сакратару ЗН Трыгвэ Лі вымаганьне, каб пытаньне «Закону пра ўзаемную бясьпечнасьць» паставіць на парадку дня ЗН у Парыжы. А 19 сьнежаня той самы Вышынскі ў сваей прамове на пасяджаньні Палітычнай Камісыі ЗН абвінаваціў ЗША ў дывэрсыйнай акцыі супраць СССР і дамагаўся інтэрвэнцыі ЗН у мэтах ануляваньня гэтага закону. Ясна, дамаганьні Вышынскага ня мелі ніякага пасьпеху.

Мы беларусы, як і ўсе іншыя паняволеныя бальшавізмам народы, можам толькі цешыцца з «Закону пра ўзаемную бясьпечнасьць» і з таго, што амэрыканская замежная палітыка пачынае набіраць кірунак, які адказвае нашым інтарэсам і імкненьням.

Паміма аднак усіх плюсаў «Закону пра ўзаемную бясьпечнасьць», нельга не заўважыць і ягоных выразных мінусаў. Як заявіў сэнатар Р. Тафт, падпольныя рухі за зялезнай заслонай зьяўляюцца «адзіным шляхам каб выйграць халодную вайну». **Вось-жа паняволеныя бальшавізмам народы згодныя праліваць сваю кроў толькі за сваё вызваленьне й дзяржаўную незалежнасьць, толькі за перамогу ў гарачай вайне, а не за тое, каб памагчы Захаду выйграць халодную вайну.**

(—іч)

За навучаньне роднае мовы

(Заканчэньне)

мусяць парупіцца нашыя арганізацыі. У найгоршым выпадку можна здабыць матарыяльныя сродкі хоць-бы шляхам дабравольных складак і ахвяраў.

Дзейнасьць у кірунку пазашкольнага навучаньня й нацыянальнага ўзгадаваньня нашага падрастаючага пакаленьня, пэўне-ж, навонкі ня будзе мець вялікага эфэкту, які, прыкладам, мае дзейнасьць палітычная. Тым ня менш, аднак, ейнае значэньне й будучыя вынікі будуць без параўнаньня большыя. чымсьці ад узаемных палітычных сварак, а навет ад канструктыўнай палітычнай працы.

ЗАДЗІНОЧАНЫЯ НАЦЫІ АБ СЫТУАЦЫІ ДП

У справаздачы ЗН аб міжнароднай праблеме уцекачоў зазначана, што ўключэньне ў гаспадарскае жыцьцё Нямеччыны 7 мільёнаў немцаў, выселеных з Усходу, займе яшчэ пэўны пэрыяд часу. Праблема гэтая ня можа быць разьвязаная шляхам эміграцыі, але шляхам паступовага ўключэньня гэтых уцекачоў у гаспадарку заходняй Нямеччыны. І ў сувязі з труднасьцямі гэтага пытаньня псыхалягічны супраціў немцаў супраць уключэньня ў нямецкую гаспадарку тых ДП, што астаюцца ў Нямеччыне, значна завострыцца.

Дзеля гэтага Задзіночаныя Нацыі дамагаюцца далейшай міжнароднай апекі й матарыяльнай помачы для ДП у Нямеччыне. У першую чаргу павінна быць створаная інстытуцыя пасярэдніцтва паміж паасобнымі ДП і альянцкай высокай камісыяй у Бон.

Справаздача ЗН сьцвярджае, што з гледзішча на блізкасьць краёў, зь якіх гэтыя людзі ўцяклі, нямецкая саюзная рэспубліка ўважаецца імі як край пераходны, а не як месца сталага асяленьня. Перасяленьне ДП ў іншыя эўрапэйскія краі зьяўляецца вельмі цяжкім. Бальшыня гэтых людзей — гэта інтэлектуалістыя або сябры сярэдняй клясы, якія ня маюць прафэсыяў, на якія ёсьць запатрабаваньне ў такіх краёх.

ЯКУБ КОЛАС

НОВАЯ ЗЯМЛЯ

П А Э М А

(4)

VI.

КАЛЯ ЗЯМЛЯНКІ

Я буду рады, калі ўдасца
Маім людцом у вашай ласцы
Хоць на кароценькі часочак
Заняць хоць цесьненькі куточак,
Жыцьцё іх, праўда, няцікава,
Пра іх нідзе ня ходзіць слава,
Аб іх гісторый не складаюць,
Пра іх і песьняў не сьпяваюць,
Апроч вятроў, што нудна ў плоце
Зімою ў горкай адзіноце
Халодны сьнег нясуць-зьдзіраюць
І бедным людзям байкі баюць
Аб жыцьці, долі іх пахілай
І плачуць-стогнуць над магілай,
Дзе косьці іх у праху тлеюць —
Адны вятры іх пажалеюць.
Але ня кажны сьцяміць мовы
І жальбы ветру між будовы:
Чаго ён жаласна сьпявае,
Каму ён песенькі складае?
І бацьку скора сын забудзе —
Каротка памятка аб людзе,
Аб простым людзе. І такая
Ўсім бедным доля выпадае:
Прайсьці свой круг, прамарнавацца
І невядомымі застацца
Ды быць забытым тут усімі —
І сваякамі і чужымі,
І мне заўсёды горка стане,
Калі я ўбачу на кургане
Пад шэрым прыкладам драўляным
Прыпынак вечны селяніна.
Стаіць там крыжык-сіраціна,
Сівенькім мохам ўвесь убраны,
З павязкай белай, даматканай.
Пытаю: хто тут пачывае?
Дзяўчына можа маладая
У поўным цьвеце красы-сілы
Сыйшла бяз часу да магілы?
Ці здатны хлопец-малайчына?
Маўчыць магіла селяніна.
А хто пахован, я ня знаю
І смутак моцны ў сэрцы маю.
А тут закопаны навекі
Надзеі, радасьць чалавека,
І гора схована ліхое —
Жыцьцё бядачае людзкое.
Мае знаёмыя няўзрачны,
Нічым ня слаўны і ня значны,
Усё людзі простыя, малыя,
Хоць пасваёму і ўдалыя,
Але ўдалымі іх ня лічуць.
Жывуць, цярпліва долю смычуць
І крыж нясуць мужычы ціха,
Дабра ня бачачы з-за ліха.
Ды што зрабіць? Я-б сам быў рады
Ня ведаць крыўды той і зрады,
Што просты люд нясе вякамі
Сваімі ўласнымі гарбамі.
Ды горкай праўды не схаваеш,
Яе ніяк не ашукаеш.
Ды і навошта? Крый нас, Божа!
А праўда мне ўсяго дарожай,
І бацька праўдзе вучыў змаля,
Дык з гэтай праўдай ступім далей.
Дзень добры, новая мясьціна!
Спаткай ты нас, як маці сына
Па часе доўгае разлукі,
І разгарні прыветна рукі
Для тых, хто змучаны ў няволі
Жывіцца хлебам твайго поля;
Зірні ты сьветлым вокам ласкі,
Авей крылом прыгожай казкі,
Каб гэта жыцьцё — пуцявіна
Была нам сьветлая часіна;
Узброй надзеямі нам грудзі,
Бо мы твае, зямелька, людзі!
На першы погляд няцікава
Парэчча тое выглядала,
І смуткам сэрца калыхала
Старых бярэзін гэтых лава,
Што на балоце між лясамі
Шумела голымі вярхамі.
Было ўсё тут параськідана,
І праслы нізкія паркана
З трухлявых шул павыяжджалі,
І трэскі кучамі ляжалі
Па ўсім дварэ і на дрывотні;
Стары хлявец без падваротні,
Гумно із стрэшкай пасівелай,
Аброслай мохам, абапрэлай,
Прыгрэбнік, хата — ўсё дачыста
Казала ясна, галасіста
Аб непарадку, запусьценьні,
Аб гаспадарскім нерадзеньні.
Сьлязьмі Міхашча залілася —
Такою ямаю здалася
Старая хата ў тры аконцы!
Парог яна пераступіла —
О, Божа добры, як няміла!
Ці сьвеціць тут калі хоць сонца?
Было так цёмна, няпрытульна,
Ў гразі — балоце ўсё агульна:
Як печ, як стол і сьцены, лавы,
І дух пракіслы, дух трухлявы
З усіх куткоў дыхнуў сярдзіта.
Зямля на ямы ўся пабіта.
Было відаць, што тут ліпелі
Да часу людзі і ня дбалі,
Гразі ніколі ня зьнімалі,
Рабіць парадку не хацелі,
Жылі пасьвінску, кацьмакамі
І ў добрай згодзе з прусакамі.
Вясна была яшчэ ў пачатку,
Але сьнягі ўжо раставалі,
І дружна ў полі балбаталі
Раўкі, рачулкі, і ў грамадку
Яны ваду сваю зьлівалі,
Ад сну гаі, лясы будзілі
І людзям душу весялілі.
І ўсё патрошку ажывала:
На дрэве покаўка таўшчала,
Ў сабе лісточак далікатны,
Пахучы, сьвежанькі, прыўдатны
На добрым сонцы гадавала.
Старыя хвоі і яліны,
Далёка кінуўшы галіны,
Глядзелі хораша, любоўна,
Як іх патомкі згодна, роўна
Стаялі гожай чарадою,
Схіліўшысь к сонцу галавою.
Ў лясох, гаёх дразды пяялі,
Ў балотах кнігаўкі крычалі;
А ў небе ўдзень і вечарамі
Высока здольнымі шнурамі
Зьлятаўся вырай жураўліны,
І амярцьвелыя даліны
Будзілі звонкім сваім крыкам,
Як-бы прыветным гэтым зыкам
Віталі родныя балоты,
Густыя лозы і чароты.
І на душы нейк весялела,
І сэрца радасьці хацела,
А думкі ціхія і мары
На душу клалі свае чары.
Хацелась жыць, ушыр разьняцца,
За долю лепшую змагацца;
Ўзьнімаліся грудзі, чулісь сілы,
І Божы сьвет здаваўся мілы.
Памалу дзень за дзень ў Парэччы
(Такая ўрода чалавеча)
Зжываліся з месцам, прывыкалі,
Гняздо старое забывалі,

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

ЧАМУ НЕ РАЗУМЕЕ НАС ЗАХАД?

(Заканчэньне)

нэры, з пад кантролі гэтай лёгка могуць выйсьці. А тады зусім праўдападобным можа быць зоркаваньне гэтых дзьвюх мілітарна сільных і індустрыяльна разьвітых дзяржаваў зь вялікай Расеяй супраць Амэрыкі, што для апошняй стварыла-б новыя й вельмі неасьпечныя камплікацыі. Блек-жа аднэй пямеччыны зь Японіяй без Расеі для ЗША, якія вырасьлі сяньня ў вялізарную мілітарную й эканамічную магутнасьць і якія бясспрэчна гэтую магутнасьць і пасьля эвэнтуальнай новай вайны захаваюць, ня будзе страшным.

Такім чынам захаваньне вялікай Расеі ў ейных сяньньшніх межах можа ў будучыні якраз зьвіхнуць тую раўнавагу сілаў у сьвеце, да якой імкнецца Захад, затое ейны распадзел на нацыянальныя дзяржавы гэтую раўнавагу бясспрэчна захавае на карысьць Захаду й загарантуе доўгатрывалы мір у сьвеце.

МАГУТНАЯ СІЛА ІЛЖЫВАЙ ІНФАРМАЦЫІ

Другая, або названая намі нутраная, прычына неразуменьня Захадам усходняе праблемы выплывае з нацыянальнай палітыкі царскай Расеі, а так-жа зь ілжывай інфармацыі аб Усходзе расейскай эміграцыі.

Захад пазнаў запраўднае палажэньне й запраўдныя нацыянальныя асьпірацыі каляровых народаў у каленіях заходніх дзяржаваў дзякуючы таму, што гэтыя дзяржавы, абмяжоўваючыся толькі да палітычнага, а не нацыянальнага паняволеньня гэтых народаў і іхнай эканамічнай эксплятацыі, ніколі не хаваў праўды аб гэтых народах. Наадварот, дзяржавы гэтыя, будучы незацікаўленымі ў нацыянальным паняволеньні каляніяльных народаў, а тым больш у іхнай асыміляцыі, якраз спрычыніліся да папулярызацыі найбольш аб'ектыўнай веды аб народах, засяляючых іхныя калёніі.

Зусім інакш прадстаўлялася справа ў царскай Расеі, якая, раўналежна зь няволяй палітычнай, сацыяльнай і эканамічнай, замацавала сыстэму жорсткага нявольніцтва нацыянальнага. Усе падбітыя ёю нерасейскія народы былі асуджаныя на поўную асыміляцыю, а таму нацыянальна-вызвольныя рухі да 1905 г. маглі там разьвівацца толькі падпольна. Найяскравейшым доказам русыфікатарскай палітыкі царскага рэжыму можа служыць факт, што да рэвалюцыі 1905 г. існавала суровая забарона беларускага друку.

Такім чынам у царскі пэрыяд толькі расейцы мелі магчымасьць інфармаваць сьвет аб Расеі, а народы нерасейскія, што становілі бальшыню насельніцтва, усякага голасу былі пазбаўленыя. Інфармацыі-ж, даваныя расейцамі, былі, як правіла, хвальшывыя, груба тэндэнцыйныя. У іх звычайна прадстаўлялася, што Расея, ня гледзячы на ейную этнічную шматскладовасьць, прадстаўляе сабою неразьдзельную цэласьць навет з гледзішча нацыянальнага, бо нерасейскія народы зьяўляюцца толькі паасобнымі плямёнамі й адгаліненьнямі вялікага расейскага народу, які, да рэчы, і ўтварыўся зь мешаніны розных этнічных групаў на славянска-расейскай базе.

АРГУМЭНТЫ РАСЕЙСКІХ ЭМІГРАНТАЎ

Пасьля бальшавіцкай рэвалюцыі ўва ўсіх краінах Захаду апынулася вялікая колькасьць расейскіх эмігрантаў, якія адыгрывалі й адыгрываюць сяньня ролю галоўных інфарматараў аб Расеі й нацыянальным у ей пытаньні. Гэтыя эмігранты зьяўляюцца й да сяньня галоўнымі дараднікамі заходніх афіцыяльных і прыватных уплывовых інстытуцыяў, умела выкарыстоўваючы сваё становішча на карысьць расейскіх імпэрыялістычных інтарэсаў. І трэба прызнацца, што іхная роля ў хвальшаваньні запраўднага палажэньня на падсавецкай тэрыторыі вялізарная, бо Захад, трымаючыся традыцыйнага спосабу думаньня аб усходняй праблеме, ахвотна прыслухоўваецца да іхнага хвальшывага голасу.

На доказ канечнасьці захаваньня адзінай і непадзельнай Расеі звычайна высоўваюць расейскія эміграцыйныя палітыкі чатыры аснаўныя аргумэнты:

1. Яны стараюцца пераканаць Захад у тым, што на тэрыторыі Савецкага Саюзу нацыянальнае пытаньне зусім ня існуе, што нерасейскія народы ніякіх нацыянальных асьпірацыяў ня маюць і ніякай дзяржаўнай незалежнасьці й аддзяленьня ад Расеі не жадаюць, а імкнуцца толькі, як і расейцы, скінуць бальшавізм, дабіцца асабістай вольнасьці й сацыяльнай справядлівасьці. Яны ў дабавак цьвердзяць, што нацыянальная праблема ёсьць выдумкай толькі групкі сэпаратыстычна настроенай інтэлігенцыі, што нацыянальныя рухі былі штучна створаныя гэтай інтэлігенцыяй падчас апошняй вайны пры выдатным падтрыманьні нацыстаўскага акупацыйнага апарату й Розэнбэргаўскага ўсходняга міністэрства.

Ілжа такога цьверджаньня відавочная, калі ўзяць пад увагу спаміж многіх іншых толькі два наступныя факты: а) Амаль усе паняволеныя народы супольнымі высілкамі сваей інтэлігенцыі й шырокіх народных масаў аднавілі ў 1917-18 г.г. свае незалежныя дзяржавы, якія потым баранілі з аружжам у руках аж пакуль ня былі пераможаныя перавагаю фізычнае сілы расейскага бальшавізму. б) Найбольш арыштаў, ссылак, расстрэлаў і адкрытых судовых працэсаў на тэрыторыі нацыянальных рэспублікаў адбывалася й адбываецца якраз за «нацыянал-дэмакратызм», «мясцовы нацыяналізм», «нацыянал-фашызм» і «нацыянальную абмежаванасьць», а гэта найлепшы довад, што нацыянальная апазыцыя там вельмі моцная, якой ня ў сілах зьнішчыць дагэтуль бальшавікі, ня гледзячы на ведамыя мэтады крывавага тэрору.

Што-ж датычыцца цьверджаньня, што нацыянальна-незалежніцкія рухі былі створаныя пры выдатным падтрыманьні нямецкага нацызму, дык у запраўднасьці справа прадстаўлялася наадварот. У тых акупаваных немцамі зонах, у якіх была заведзеная нямецкая цывільная адміністрацыя, немцы наагул ня мелі выразнай нацыянальнай палітыкі й ставіліся да нацыянальнай праблемы нерасейскіх народаў вычэкваюча, церпячы, хочь і неахвотна, чыста культурную дзейнасьць, а катэгарычна забараняючы дзейнасьць палітычную. Затое на тых тэрыторыях, якія знаходзіліся пад ваенным упраўленьнем (на Беларусі на ўсход ад Барысава), немцы, акружаныя расейскімі дараднікамі — «зондэрфюрэрамі», праводзілі выразна прарасейскую палітыку. Прыкладам, прэса для мясцовага насельніцтва выдавалася ваенным аддзелам прапаганды выключна ў расейскай мове (выдаваныя ў кажнай акрузе газэты — «Новый Путь» і інш.).

Таму цьвердзіць, што немцы стварылі незалежніцкія рухі нерасейскіх народаў у той час, калі ў запраўднасьці яны гэтыя рухі душылі а прапагавалі расейшчыну, зьяўляецца нахабнай ілжой.

2. Другім аргумэнтам, якім хочаць расейцы застрашыць Захад, ёсьць цьверджаньне, што калі Захад стане на пазыцыях распадзелу Расеі, дык у будучай вайне будзе ён мець супраць сябе ўвесь расейскі народ.

Гэты аргумэнт зьяўляецца ня чым іншым, як палітычным шантажом, бо ня мае ён пад сабой ніякіх рэальных падставаў. Мы, знаючы расейскі народ, моцна сумляваемся, ці ён, будучы цэлымі стагодзьдзямі прызвычаены да нявольніцкага жыцьця, выступіў-бы нагул актыўна супраць бальшавізму, так як ні разу ня выступіў супраць яго ў шырэйшых маштабах дагэтуль, тады, калі на нерасейскіх тэрыторыях адбываецца ўвесь час бесьперапыннае змаганьне супраць бальшавізму, якое, у залежнасьці ад абставінаў, або выліваецца ў форму збройных партызанскіх войнаў, або абмежваецца да пасыўнага супраціву. Таму ёсьць усе падставы думаць, што на выпадак вайны, незалежна ад таго, зь якімі лёзунгамі будзе йсьці на ўсход заходняя армія, расейскі народ у найлепшым выпадку захаваецца пасыўна.

3. Трэйцім аргумэнтам, якім апэруюць расейскія эмігранты, ёсьць цьверджаньне, што ў той час, калі ў цэлым сьвеце што раз больш актуальным становіцца імкненьне да розных міждзяржаўных задзіночаньняў у форме вуніяў, блёкаў, фэдэрацыяў, зусім не мэтазгодным ёсьць усякае раздрабненьне, а таму й Расея павінна быць захаваная, як непарушная цэласьць.

Гэты аргумэнт зьяляецца ня менш слабым за папярэднія. Ніводзін з паняволеных народаў не зьяўляецца праціўнікам актуальнага сяньня ў сьвеце міждзяржаўнага задзіночаньня. Але кажны зь іх жадае ў такую задзіночаную канстэляцыю дзяржаваў увайсьці вольным і стацца ў ей раўнапраўным партнэрам, разумеючы, што ня можа быць ніякага задзіночаньня, ніякай вуніі ці фэдэрацыі між нявольнікам і панявольваючым, між вязьнем і турэмным вартаўніком.

4. Распадзел расейскае імпэрыі на нацыянальныя дзяржавы прывяло-б, — як цьвердзяць расейцы — да балканізацыі эўрапэйскага Усходу й падсавецкай Азыі, што ў далейшую чаргу магло-б толькі выклікаць бесьперапынныя споры, а навет міжусобныя войны.

Гэты аргумэнт спаміж усіх, вышэй прыведзеных, зьяўляецца бадай што найслабейшым. Калі-б, прыкладам, і заіснавалі некаторыя споры між паасобнымі дзяржавамі паняволеных сяньня народаў, то ў сваей шкоднасьці для сусьветнай бясьпечнасьці не маглі-б яны быць на столькі грознымі й небясьпечнымі, як споры, змаганьне й навет збройныя паўстаньні паняволеных народаў супраць Масквы, якія, у выпадку захаваньня турмы народаў напэўна будуць мець месца.

Ня гледзячы на тое, што ўсе гэтыя аргумэнты зьяўляецца ў істоце сваей нясур'ёзнымі й іхны хвальш відавочны, усё-ж такі яны маюць яшчэ значны ўплыў на заходнюю мэнтальнасьць, прызвычаеную да закасьцянелага ў сваіх формах традыцыйнага спосабу думаньня.

ЛЕД ПАМАЛУ ПРАЛОМЛІВАЕЦЦА

У вапошнія гады на Захадзе пачалася аднак павольная, але грунтоўная рэвізыя паглядаў на ўсходнюю праблему. Сярод многіх заходніх людзей, што пачалі вызваляцца ад агульна прынятага шаблёну думаньня й разумець нацыянальнае пытаньне падсавецкага Усходу так, якім яно ёсьць у запраўднасьці, знаходзяцца ўжо ўплывовыя палітыкі й дзяржайныя мужы, якія ня толькі ўважаюць за патрэбнае разьвязаньне нацыянальнага пытаньня Усходу ў духу нашых імкненьняў, але становяцца навет запраўднымі піянэрамі папулярызацыі на Захадзе нашых ідэяў і шчырымі абаронькамі нашых нацыянальных інтарэсаў.

Да такіх людзей у Ангельшчыне належыць у першую чаргу старшыня Шкоцкай Лігі за Свабоду Эўропы Дж. Ф. Стуарт і выдатны вайсковец і ўплывовы публіцысты генэрал-маёр Дж. Ф. С. Фулер. Што раз болей такіх людзей паяўляецца й у ЗША. Апрача былага рэспубліканскага кандыдата на прэзыдэнта сэнатара Г. Стасэна, да гэтай групы людзей належаць яшчэ сэнатар О'Конор, сэнатар Смітс, кангрэсмэны Кэрстэн, Смэтэрс, Борыс, Армстронг і іншыя.

Гэтыя людзі дамагаюцца распадзелу расейскае імпэрыі на нацыянальныя дзяржавы паняволеных народаў ня толькі ў імя дэмакратычных ідэяў, але й дзеля таго, што гэта зьяўляецца гістарычнай канечнасьцю й ляжыць у інтарэсах Захаду, што гэта адзіны спосаб перамогі над бальшавізмам і ўстанаўленьня трывалага міру ў сьвеце.

Трэба верыць, што на гэткі шлях раней ці пазьней будзе змушаная ўзыйсьці й афіцыяльная палітыка заходніх дзяржаваў, бо гэтага вымагаюць палітычныя інтарэсы самога-ж Захаду.

Язэп Каранеўскі

Пакідаем Менск

(УСПАМІН)

Год 1944. Парываючыя тоны маршу бадзёрым рэхам нясуцца панад руінамі Менску. Гэта дзень 22-га чэрвеня — III-я ўгодкі жыцьця сталіцы, вольнага ад камуністычнага ярма.

У прыгожую летнюю раніцу, калі горад купаецца ў сонцы, а паветра здаецца віброуецца хвалямі згодна прыгожым мэлёдыям музыкі, робіцца ўражане, што ноч, зь якой толькі што Менск абудзіўся, астаецца далёка у няпамяці, як-бы штосьці нерэальнае, ня маючае месца ў сталіцы-сэрцы Беларусі, якое цяпер так жыва б'ецца. Толькі шэрыя хмаркі дыму уносячыся над горадам з дагараючых дамоў, сьветчаць аб ёй, што яна адбылася. Сьветчаць аб ночы, у якую неба становіцца чырвоным, а рэхат самалётаў, гук рвучыхся бомбаў і артылерыйскіх снарадаў зьліваюцца ў вадзін працяжны гул...

Але і гэтая ноч мінула, як кажная папярэдняя, і горад сустрэў ясную раніцу 22 чэрвеня.

Уздоўж вуліцы 25-га Сакавіка, паміж шматлікіх калёнаў розных фармацыяў і ўстановаў, да трыбуны зьліжаюцца дзьве роты Беларускай Афіцэрскай Школы. Шчыльнымі, роўнымі радамі маладыя жаўнеры адбіваюць адрывістыя шагі. Тры сотні будучых афіцэраў твораць як-бы адзін зялезны арганізм — калёну цьвёрда машыруючую наперад, у якой кажны рух крыє ў сабе згарманізаваную маладую сілу й энэргію. Прысутная публіка ня вытрымоўвае. Выбухае бурай воплескаў. Так вітаюць шэрагі афіцэрскае школы. Вітаюць тых, якія сваей паставай сьветчаць, што беларуская справа мае абаронцаў. Вітаюць рэпрэзэнтантаў маладога пакаленьня, якое пад бальшавіцкімі бомбамі гартуецца, каб памсьціць крыўду сваіх бацькоў. Сталёвым шэрагам яны моўчкі пасоўваюцца між сьценамі энтузыястычна вітаючых іх мянчанаў. Але іх вочы гавораць. Гавораць, што яны апраўдаюць надзеі ў іх пакладаныя. Бо ў гэтых маладых вачох іскрыцца Беларусь...

З начы на ноч алярм. Кажны ідзе на супачынак з тым, што за хвіліну паветра прарэжа трывожны гудок сырэны...

Паўночныя Казармы на ўскраінах Менску. Там месьціцца афіцэрская школа. Кажную ноч маладыя жаўнеры падрываюцца, каб правесьці некалькі гадзін у вакопах. Не аднаму зь іх, стоячаму ў сырым рове, прыходзе на думку яго родная мясьціна, сям'я і той час, калі даведаўшыся аб новапаўстаўшай школе, не задумоўваючыся, уступіў у рады яе сяброў. Але ні адзін зь іх не шкадуе таго ўчынку. Кажны разумее ўзятыя на сябе заданьні і тыя цяжкасьці, якія ў сувязі з апошнімі палітычнымі падзеямі рысуюцца на шляху яго будучыні...

29 чэрвень. Прыходзе загад пакавацца і вырушаць на захад, з болем сьціскаюцца маладыя сэрцы, калі страшная рэчаіснасьць у поўнасьці сваей пагрозы становіцца яўна перад ачыма, — пакінуць безбаронную Бацькаўшчыну й ісьці ў няведамую чужыну, няведама на як доўгі час.

Дзесяткі кілёмэтраў цягнецца непраравны вуж уцекачоў уздоўж дарогі Менск—Маладэчна, Маладэчна—Вільня. Гэтым-жа шляхам прабіваецца калёна афіцэрскае школы. Яшчэ раз апошні позірк назад. На ўскраіне запыленага гарызонту ўжо ледзь, ледзь рысуецца, тонучы ў далі вобраз Менску. Бывай каханы горад! Бывай і вытрывай да часу, калі мы ўласнымі грудзьмі прабём дарогу да тваіх брамаў!...

Яр.

І праз якіх дзьве-тры нядзелі
Ўжо весялей на сьвет глядзелі
Будынкі гэтыя старыя —
Яны зрабіліс, як ня тыя.
Агледзіў іх Антось, паправіў,
І шулы новыя паставіў
Ў гнілы паркан, і лом сабралі,
Ды шыбы ў вокны паўстаўлялі,
Бо ня любілі непарадку,
І пачалі жыць зноў спачатку.
Ды йзноў бяда: праз год вясною
Згарэла хата з варыўнёю
І ўвесь набытак, што быў ў дому.
Пажар той выбухнуў, як з грому,
Хоць ён і меў свае прычыны.
Як на бяду пайшлі мужчыны
І Ўладзік зь імі ў рассыпную:
Адзін у лес, той да адбору,
З сахою трэці ў гэту пору
Араў дзесь пасеку старую;
Чык што магла зь дзяцьмі малымі
Зрабіць жанчына адзінютка?
І ўсё згарэла дачысьцютка,
Прапала марна ў чорным дыме.
Зазнала жалю гаспадыня:
Ў вагні згарэла яе скрыня
З усім пасагам і набыткам;
Прапалі хусты яе, сьвітка,
Згарэлі кросны, рад багоў,
І грошай сорак сем рублёў.
Хоць праўда, Костусь не збаяўся
І сьмела з пожарам змагаўся:
Звалок гарошыны з пасьцелі,
Тады, як вопраткі гарэлі,
І зь імі доўга ён насіўся,
Аж покі зруб не паваліўся.
Бяда, хоць плач, і дзе дзявацца?
Куды ад холаду схавацца?
І маці з дзеткамі малымі
Нядзелі дзьве жыла з сваімі.
А на пажарышчы часова
Зьявілась новая будова —
Зямлянка — будачка малая,
У вадно акеначка, крывая,
Але да часу доора й гэта.
Тымчасам сонца йшло на лета,
Дык так-сяк кідаліс, качаліс,
Хоць дужа з горам спазнаваліс.
Каля зямлянкі тут прыветна
Гарэў агоньчык ледзь прыметна,
Абы ня зьвеуся. Вечарамі
Тут маці ўходжвалась з гаршкамі,
Сям'і вячэру гатавала,
Тады зямлянка ажывала:
Сьмяялісь дзеці, мятусіліс,
Як рыба ў букце, варушыліс,
Бярвенцы, трэсачкі сьцягалі
Ды на агоньчык падкідалі.
Шугала полымя праворна,
Як-бы чагось каму сьмяялась
І то свавольна ўгору рвалась,
То расьцілалася пакорна.
А ветрык, злодзей, ня стрывае,
З-за хаткі хітра налятае,
Ў вагоньчык раптам уварвецца;
Агонь туды-сюды матнецца
І дымам ветра адбівае,
Як-бы тых жартаў ня прыймае,
А на двары ўжо вечарэе,
І ночка блізка, змрок гусьцее
Агоньчык колер свой мяняе
І чырван-жоўты блеск прыймае;
І моўкнуць птушкі ў цёмным лесе;
Баранчык Божы ў паднябесьсі
Бляе маркотна над балотам,
Як-бы шукае ён каго там,
І гэта смутнае бляньне
Ў цішы балот у час зьмярканьня
На сэрцы жалем аддаецца
І ў душу журбаю ліецца,
І мары розныя наводзіць.
І думка вынікне — праходзіць,
Як тыя хмаркі на заходзе,
Што безь сьлядочка, быццам цені,
У смутным нікнуць задуменьні.
Маўкліва — сьцішна ўсё ў прыродзе!
Напрацаваўшысь, спачываюць
Усе старэйшыя, — хто ў хатцы,
А хто ў гумне ўва ўсей апратцы —
І гэтак ночкі прасыпаюць.
І вось, бывала, вечарамі
Каля агоньчыку часамі
Алесь і Костусь засядзяцца.
А як ужо пачне зьмяркацца
І зоркі ў небе замігаюць,
Пужаць іх страхі пачынаюць.
Тады браты радком садзяцца,
Плячо ў плячо, але прызнацца,
Што страшна ім, ніхто ня хоча,
— Алесь, ты чуеш, як рагоча
Ў бярэзьніку баранчык Божы?
Але ці ведаеш, з чым схожы
Той дробны рогат? Мне здаецца,
Антось Тацянін так сьмяецца! —
І хлопцы ўраз зарагаталі,
Ды ўраз-жа сьмех той абарвалі:
Вакол было ўсё так спакойна,
Дык гэты сьмех нейк няпрыстойна
Сюды, ў пакой начны ўрываўся —
Самым ён дзікім ім здаваўся.
Маўчаць яны. Касьцёр палае.
Вакол усюды цьма густая
Пілнуе плямку агнявую
І гэту зорку залатую,
Што ў нутрах цьмы агонь сьвідруе,
Каб зьнішчыць блеск. Агонь сярдуе
І цьме ніяк не паддаецца;
Часамі полымя прарвецца
І цьма сярдзіта схісянецца,
Адскочыць далей на паўкрока.
Агонь блішчыць, як воўча вока.
Паволі дрэўцы дагараюць,
І ціха іскрачкі ўзьлятаюць
І гаснуць борзда безь сьлядочка.
Ўжо позны час, глыбока ночка,
А хлапчукі сядзяць маўкліва
І навакол глядзяць пужліва.
У іх фантазыі дзяцінай,
Затканай страху павуцінай,
Устаюць начныя страхі, здані,
І зыкі чуюцца пагані,
Чараўніка і чараўніцы,
І лопат крыльлямі начніцы.
А кажны куст ім дзеда родзіць
Таго, што ўсюды лазіць, ходзіць
Зь мяшком і мяліцай-кульбою
І з доўгай сівай барадою,
Ідзе і дзетак забірае,
Сьлед барадою замятае.
На полі неба лес страхлівы
Стаіць зацяты, нярухлівы.
Што ён ў сабе цяпер хавае?
Снуецца нечысьць там ліхая,
Мярцьвец пад елкай прытуліўся,
На іх цяпер утарапіўся
І зараз мёртваю рукою
Пачне хрысьціць перад сабою,
Каб рух адняць, скаваць іх сілу,
Каб зацягнуць іх у магілу.
Там ходзіць страшны воўк-бадзяга,
Разбойнік крадзецца, туляга,
З акрываўлёнаю рукою
І з страшнай цяжкай булавою.
Шалёны бегае, пужае,
Каго ні стрэне — ўсіх кусае...
— Ну, што, брат Костусь, ці баішся?
Куды так пільна ты глядзіш ўсё? —
Алесь паціхеньку пытае.
І руку брата ня пускае.
— Ці бачыш што? — Не, так, нічога! —
Гаворыць Костусь, а ў самога
На лоб кучомка напаўзае...
— Мо' пойдзем, братка? — ён гаворыць.
Алесь ахвоцен і ня спорыць.
Браты за рукі пабяруцца,
Ў зямлянку вобцас панясуцца.

(Далей будзе)

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

Да гісторыі змаганьня Каўказу

Ад Рэдакцыі: З мэтаю інфармаваньня нашых чытачоў аб вызвольным змаганьні запрыязьненых з намі паняволеных народаў зьмяшчаем ніжэй артыкул паўночна-каўкаскага палітычнага дзеяча А. Магомы, узяты намі з № 1 за 1951 г. часапісу «Кавказ».

Каўказ займае тэрыторыю ў 350.000 кв. кілямэтраў з насяленьнем згодна апошняй савецкай статыстыкі, 12.550.371 чалавек, зь якіх карэнных каўкасцаў больш дзесяці мільёнаў. Каўказ па свайму разьмеру ў адзіннаццаць разоў большы за Бэльгію й большы за Вялікабрытанію й Ірляндыю ўзятых разам.

У мінуўшчыні Каўказ быў месцам пераходу народаў за часоў іхных вялікіх перасяленьняў, што згуляла вялікую ролю ў фармаваньні складу насяленьня. На Каўказе сяньня жывуць чатыры аснаўныя народы: азэрбайджанцы, армяне, грузіны й паўночна-каўкасьцы (дагестанцы, чэчэна-інгушцы, асецины, карачай-балкарцы, адыгі: чаркесы й кабардзінцы). Яшчэ ня так даўно паўночныя граніцы Каўказу даходзілі да дугі Волга-Дон. Так, паводля, Царградзкага трактату 1728 г., заключанага паміж Турцыяй і Расеяй, граніцы Чаркесыі, г. зн. Паўночнага Каўказу, былі ўстаноўленыя ў 10 гадзінах коннай язды на паўдня ад Дону, а цераз адзінаццаць год, паводля Белградзкага дагавору, была прызнаная незалежнасьць Чаркесыі.

Адменнай рысай усіх каўкасцаў быў і астаецца глыбокі каўкаскі патрыятызм, які даў ім сілу захаваць на працягу тысячагодзьдзяў свае прыгожыя традыцыі, сваю нацыянальную індывідуальнасьць.

Народы Каўказу, калі Расея ня мела яшчэ аформленае дзяржаўнае структуры, былі ў дыпляматычных і эканамічных дачыненьнях із старажытнымі цывілізаванымі народамі: Асырыяй, Бабілёніяй, Пэрсыяй, Грэцыяй і Рымам. Аб гэтым сьветчыць Гэродот, Страбон і другія грэцкія й рымскія гісторыкі. Паводля іхных словаў, ужо ў той час Грузія (Калхіда) мела добра зарганізаваны дзяржаўны апарат, у ей была высака разьвітая культура й эканамічнае жыцьцё. Што датычыцца Армэніі, то яшчэ доўга да Нараджэньня Хрыста армянская дзяржава мела вагу вялікай дзяржавы, якая дасягнула апогэю свайго вялічча пры Тыгране Вялікім.

Згодна словаў расейскага гісторыка Растоўцава, што апісваў жыцьцё продкаў паўночна-каўкасцаў і азэрбайджанцаў да нашай эры, «яны мелі разьвіты спосаб жыцьця, былі ў сталых гандлёвых дачыненьнях із сваімі паўдзённымі й усходнімі суседзямі й мелі параўнача высокую гаспадарскую ўзроўню. Яны займаліся жывёлагадоўляй і земляробствам. Грэцкія калёніі знайшлі сярод іх гатовых спажыўцоў для сваіх тавараў і пасярэднікаў для сувязяў з Паўднём і Ўсходам» (Сандэрс: «Гісторыя Каўказу»).

Каўказ у мінуўшчыні палітычна разьдзяляўся на паасобныя царствы й княствы. Аднак, калі ім загражала вонкавая небясьпека, яны задзіночваліся ў ваенныя саюзы й супольнымі сіламі адбівалі ворага. Пад знакам адзінства прайшло змаганьне ў I стагодзьдзі да Нараджэньня Хрыста з Пампэем, у IV ст. з гунамі, у VI ст. з хазарамі, у IX ст. з куманамі й у XIII ст. з манголамі. Зусім прыродна, што іхныя паходы пакінулі свае сьляды, прыносячы некаторыя палітычныя зьмены.

У IV ст. на Каўказ пранікае хрысьціянства, якое мела вялікі ўплыў на разьвіцьцё армянскай і грузінскай культураў.

У VII ст. прыйшлі арабы, пад уплывам каторых часьць насельніцтва Каўказу прыняла музулманства: азэрбайджанцы й амаль усё насельніцтва Паўночнага Каўказу.

Аднак, навет музулманская часьць Каўказу не пагадзілася з насяганьнем на сваю незалежнасьць з боку сваіх аднавернікаў. Так прыкладам, Надыр — пэрскі шах, заваёўнік «Вялікага Магола» Індыі, вырушыў паходам на Каўказ, які скончыўся поўным крахам. Першы раз ён быў пабіты ў Нусе (Азэрбайджан) арміяй Хаджы-Чэлебі-Хана, а пад аулам Чох (Дагестан) ён быў разьбіты на галаву й уцёк назад.

Прызнаючы вялікае значэньне Каўказу ў сэнсе стратэгічным, палітычным і эканамічным, тагачасныя вялікія дзяржавы — з паўдня Пэрсыя й Турэччына, з поўначы Расея — рабілі вялікія намаганьні з мэтаю ўключэньня яго ў сфэру свайго ўплыву. Аднак, дзякуючы ўроджанай волялюбнасьці й самаахвярнасьці, каўкаскім народам удалося захаваць сваю незалежнасьць да XVIII ст., калі Каўказу прыйшлося ўступіць у доўгае й крывавае змаганьне проціў расейскага колёса за самабытнасьць і свабоду.

Імпэрыялістычнае расшырэньне межаў Расеі было адменнай рысай усіх урадаў, не выключаючы й часовага ўраду, міністар замежных справаў якога Мілюкоў мроіў атрымаць Босфор і Дарданэлы. Палітыка Савецкага Саюзу астаецца таксама вернай гэтай спадчыне, але яна яшчэ больш агрэсыўная, ставячы сваей мэтай сусьветнае панаваньне.

Расея заўсёды імкнулася й імкнецца пранікнуць да цёплых мораў, да Стамбула, Пэрсыдзкага заліву, Індыі. На гэтым шляху яна статкала вялікі супраціў каўкасцаў.

Расея падпарадкавала ў 1801 г. Грузію, і да 1830 г. паступова, пасьля зацятых баеў, уключыла ў сваю дзяржаву Армэнію й большую часьць Азэрбайджана. Аставалися не паняволенымі часьць Азэрбайджана і Паўночныя Каўказ, якім прыйшлося весьці змаганьне, якое пачалося ў канцы XVIII ст., пад кіраўніцтвам шэйка Мансура. Гэтае змаганьне прыняло характер запраўднай рэгулярнай вайны ў 1834 г., калі Імамам быў выбраны Шаміль — сьвецкі й духоўны правадыр.

Эўрапэйскія, у прыватнасьці ангельскія газэты былі поўныя артыкулаў аб гераічных чынах каўкаскіх патрыётаў.

Вайна Шаміля была змаганьнем ня толькі за вызваленьне Паўночнага Каўказу. У радох ягонай арміі прыймалі ўдзел азэрбайджанцы, а таксама грузінскія часьці пад кіраўніцтвам царэвіча Аляксандра.

Найлепшым доказам таго, што каштавала Расеі змаганьне з Каўказам, служаць словы расейскага гісторыка Фадзеева: «Вайна з каўкаскімі горцамі вымагае ад нас такой вялікай арміі (280.000 чалавек), зь якой мы маглі-б прайсьці маршам ад Эгіпту да Японіі». Іншы гісторык гаворыць: «Змаганьне з Каўказам затрымала Расею на 80 гадоў ад выкананьня сваіх гістарычных місыяў».

Інакш гаворачы, гэтае змаганьне затрымала расейскую экспансыю на 80 гадоў, дзеля чаго атрымала асаблівае **гістарычнае значэньне.**

У 1859 г. Шаміль папаўся ў палон, але Заходні Каўказ прадаўжаў вайну да 1864 г. Гэтая дата лічыцца годам сканчэньня «Каўкаскай вайны».

У тым-жа годзе пачалося прымусовае высяленьне чаркесаў. Больш мільёна чаркесаў было выселена ў Турэччыну, тагачасную Атаманскую імпэрыю. Каўкаскія народы ніколі не згаджаліся з чужаземным ярмом і заўсёды шукалі адпаведнага палітычнага мамэнту, каб пазбавіцца ад Расеі. Аб гэтым сьвецчыць мноства паўстаньняў ува ўсіх часьцях Каўказу да 1917 году.

Падчас рэвалюцыі каўкасьцы абвесьцілі ў травені 1918 г. сваю дзяржаўную незалежнасьць: 2 травеня Паўночны Каўказ, 26 травеня — Грузія, а 28 травеня Армэнія й Азэрбайджан. Абвешчаньне дзяржаўнай незалежнасьці ня было зьявай прыпадковай, выкліканай імкненьнем пазбавіцца расейскай анархіі на Поўначы, а лёгічным вынікам тых гістарычных імкненьняў і ахвяраў, якія яны панесьлі за сваю свабоду.

За кароткі пэрыяд свайго існаваньня, каўкаскія рэспублікі пасьпелі, на дэмакратычных асновах, стварыць свой дзяржаўны апарат, адрадзіць разваленае рэвалюцыяй сваё гаспадарскае жыцьцё, правесьці аграрныя рэформы, стварыць у родных мовах свае школы — ад пачаткавай да вышэйшай, — прыступіць да фармаваньня сваіх нацыянальных арміяў, выпусьціць свае грашовыя знакі, стварыць усе неабходныя нацыянальна-культурныя, навуковыя й сацыяльныя ўстановы, навязаць дыпляматычныя дачыненьні з многімі дзяржавамі, якія прызналі іх дэ-факто, а некаторыя й дэ-юрэ.

Трэба адцеміць, што Азэрбайджан і Паўночны Каўказ былі першымі музулманскімі дзяржавамі, што выбралі рэспубліканска-дэмакратычную форму кіраўніцтва.

На жаль, мір і спакой на Каўказе трывалі ня доўга. Узноў уваскрэсла заваявальніцкая традыцыя Расеі, ужо ў другім выглядзе, і ўзноў пачалася вайна, якая ня спыняецца й да сяньня. Камуністыя, пасьля перамогі над «белай арміяй», усе свае намаганьні накіравалі на заваяваньне Каўказу, які распараджаецца найбагацейшымі эканамічнымі магчымасьцямі, як у сэнсе сельскае гаспадаркі, так і ў сэнсе сваіх нетраў: жалеза, серабро, золата, марганец, ртуць і мінэральныя воды, не гаворачы ўжо аб нафце, значэньне якой ведамае ўсяму сьвету.

Імкненьне камуністых акупаваць Каўказ зусім зразумелае, так як ён хавае ў сабе ня толькі нявычарпаныя багацьці, але й прадстаўляе, дзякуючы свайму геаграфічнаму палажэньню, вельмі добры пляцдарм, адкуль лёгка пранікаць у краіны Блізкага Ўсходу для падрыўной і захопніцкай дзейнасьці.

Балшавіком прышлося весьці зацятае змаганьне супраць каўкаскіх рэспублікаў, якое прадаўжалася больш паўтара году й каштавала ім вялікіх ахвяраў.

У канцы мая 1921 г. былі акупаваныя ўсе каўкаскія рэспублікі. Чырвоныя фармальна пакінулі назовы каўкаскіх рэспублікаў, за выключэньнем Паўночнага Каўказу, які яны, згодна старынага рэцэпту («Дзялі й пануй»), разьбілі на некалькі аўтаномных рэспублікаў і акругаў, а ўсю ўладу фактычна сканцэнтравалі ў руках маскоўскіх сатрапаў.

На Каўказе наступіла эпоха жахлівага тэрору. Але ня гледзячы на савецкую «перакоўку», каўкасцы захавалі любоў да свабоды й незалежнасьці.

Пачынаючы з 1921 г. на Каўказе адбываюцца бесьперарыўныя паўстаньні: у 1921 г. у Азэрбайджане й Армэніі; у 1924 г. — у Грузіі; у 1926 г. — у Азэрбайджане й Паўночным Каўказе; у 1931 г. — у Паўночным Каўказе й узноў у Азэрбайджане; у 1937 і 1942 г.г. у Паўночным Каўказе, не гаворачы ўжо аб дробных паўстаньнях і партызаншчыне, якія сталіся там штодзённым зьявішчам.

Закрыцьцё мэчэтаў і цэркваў, замена іх на калгасныя амбары й клюбы бязбожнікаў, перасьледваньне духавенства, ссылка ў Сібір і Сярэднюю Азыю людзей, як «буржуазных нацыяналістых», «кулакоў», пагалоўнае насельніцтва навет цэлых музулманскіх плямёнаў, гаворачы коратка, нявыноснае чужое прыгнечаньне ўсё больш і больш прыводзіць каўкасцаў да сьведамасьці, што ў іх супольная доля, супольныя інтарэсы.

— «Адзінства Каўказу»! — сталася лёзунгам усіх, як дома, так і за мяжой. Гэтая аснаўная думка здабыла сярод каўкасцаў на столькі вялікую папулярнасьць, што няма сяньня бадай ніводнага палітычнага дзеяча, які-б яе не падзяляў. Такім чынам Каўказ нутрана перабудаваўся, аформіўся й узмоцніўся ў сваіх палітычных імкненьнях. Яго мэта — незалежнасьць.

Да гэтай сьвятой мэты каўкасцы йдуць рука ў руку з усімі паняволенымі народамі. Мы верым у надыход гэтага сьветлага мамэнту.

†

СЬВЯТОЙ ПАМЯЦІ

АЛЯКСАНДАР ПРАТАС

Дня 4 сьнежаня 1951 г. у гор. Стэмфорд у ЗША на 85-ым годзе жыцьця скончыў жыцьцёвы й цярністы шлях сьв. пам. Аляксандар Пратас.

А гэты ягоны шлях быў узапраўды цяжкі й цярністы. Ад маладых год Нябожчык цяжка працаваў над паленьнем гаспадаркі, якая засталася Яму пасьля сьмерці бацькі ў хв. Забалоцьце Дзісьненскага пав.

За часоў польскай акупацыі Яму прышлося выцярпець нямала няпрыемнасьцяў, а навет зьнявагаў, ад польскай адміністрацыі. Прычынай гэтаму было тое, што Нябожчык ніколі ня выракся беларускасьці й заўсёды супрацьставіўся палянізацыйнай палітыцы ўладаў, а таксама тое, што сваіх дзяцей Ён выхоўваў у любові да Бацькаўшчыны й усяго таго, што ёсьць беларускім. Пасьля акупацыі бальшавікамі Заходняй Беларусі ў 1939 г. для Яго пачаліся новыя цярпеньні. Як «кулака» выгналі Яго з жонкай з роднай хаты й на старыя гады яны змушаныя былі бадзяцца па чужых кутох.

Дня 6 сьнежаня Япіскап БАПЦ Васіль у прысутнасьці беларусаў із Стэмфорду й аколіцаў адвёў Яго на вечны спачынак на мясцовых могілках.

Сьпі спакойна, Дарагі Дзедка, і няхай Табе прысьніцца Родная Зямелька, якую Ты так кахаў!

Зямляк

ДА НАШЫХ ЧЫТАЧОЎ

Выдавецтва «Бацькаўшчыны» знаходзіцца ў цяжкім матарыяльным палажэньні, дзеля таго ня можа высылаць надалей газэты задарма тым, якія за яе могуць плаціць. Газэта можа высылацца бясплатна толькі безработным беларусам.

У сувязі з вышэйшым усім тым, якія безадкладна не ўрэгулююць залегласьці за «Бацькаўшчыну», высылка газэты, пачынаючы з нумару 6/85, будзе спынена.

Усіх нашых Прадстаўнікоў паза Нямеччынай і кальпартэраў просім застацца да вышэйсказанага.

Выдавецтва «Бацькаўшчыны»

Спор за лінію Кэрзона у Тэгеране

У ангельскай газэце «Дэйлі Тэлеграф» за 11. 12. 1951 г. ў сэрыі артыкулаў-успамінаў Чэрчыля пра другую сусьветную вайну — надрукаваная цікавая размова між прэзыдэнтам Рузвэльтам, Чэрчылем і Сталінам падчас канфэрэнцыі ў Тэгеране 1 сьнежаня 1943 г. ў справе лініі Кэрзона. Дзеля таго, што гэтая размова прыносіць некалькі цікавых дадзеных у справе ўстанаўленьня ўсходніх межаў Польшчы, падаём ніжэй у беларускім перакладзе адпаведны фрагмэнт успамінаў Чэрчыля.

«Я сказаў — піша Чэрчыль — што польскае пытаньне для нас у Задзіночаным Каралеўстве ёсьць важным таму, што мы абвесьцілі вайну Нямеччыне за напад на Польшчу... Расея абараняла рэканструкцыю, разьвіцьцё й экспансыю Польшчы галоўна коштам Нямеччыны. Але Сталін аддзяляў Польшчу ад польскага ўраду на эміграцыі. Ён парваў з польскім урадам не з за капрызу, а таму, што гэты ўрад прылучыўся да Гітлера ў паклёпніцкай прапагандзе супраць Расеі. Якая была гарантыя, што гэта не паўторыцца? (Парваньне дачыненьняў узапраўднасьці наступіла ў сувязі з адкрыцьцём Катынскіх магілаў — Рэд.).

Сталін хацеў запэўненьня, што польскі ўрад па выгнаньні ня будзе падбухторваць да забіваньня партызанаў, а наадварот, будзе заклікаць палякаў да змаганьня супраць немцаў і ня будзе ўмешвацца ў ніякія махінацыі. Ён, Сталін, прывітае ўсякі польскі ўрад, які зробіць вышэй успомненыя захады, і ён ужо быў-бы рады аднавіць зь ім дачыненьні...

Тады я сказаў, што для нас было-б вялікім падтрыманьнем, калі-б мы кругом гэтага стала даведаліся аб расейскім паглядзе на граніцы Польшчы. Тады я меў-бы прадставіць справу палякам і выразна сказаць, ці ўмовы ўважаю за справядлівыя. Урад Іх Каралеўскай Вялікасьці, ад імені якога я гаварыў, хацеў атрымаць магчымасьць сказаць палякам, што прыгатаваны плян добры й найлепшы з магчымых, і што ўрад ня мае намеру запярэчваць яго пры мірным стале... Тое, чаго мы хацелі, было аднаўленьне сільнай і незалежнай Польшчы, прыязнай да Расеі.

Сталін сказаў, што ўсё гэта праўдзіва, але палякам ня можна займаць украінскіх і беларускіх тэрыторыяў. Гэта было несправядліва. Згодна з граніцаю з 1939 г., (г. зн. пасьля 17 верасьня 1939 г. — Рэд.) землі Украіны й Беларусі былі зьвернуты Украіне й Беларусі. Савецкая Расея прыхілілася да граніцаў з 1939 г., бо яны былі правільнымі з этнаграфічнага гледзішча.

Ідэн перапытаў, ці гэта абазначала лінію Рыбэнтроп-Молатаў. «Называйце яе, як хочаце», сказаў Сталін.

Молатаў зацеміў, што лінію агульна называюць лініяй Кэрзона.

«Не», — сказаў Ідэн. — «між імі ёсьць паважныя розьніцы».

Молатаў сказаў, што такіх розьніцаў няма.

Тады я паказаў карту, а на ей лінію Кэрзона й лінію з 1939 г., закрэсьліваючы таксама лінію Одры. Ідэн зазначыў, што паўдзённы канец лініі Кэрзона ніколі ня быў азначаны ў перагаворах...

Ідэн падказваў, што лінія Кэрзона па задуме павінна была праходзіць на ўсход ад Львова. Сталін адказаў, што лінія на маей карце ня была азначаная правільна. Львоў павінен быў астацца па баку расейскім, а лінія павінна праходзіць у заходнім кірунку ў бок Перамышля... Ён зацеміў, што ён ня хоча ніякага польскага насельніцтва й што, калі-б знайшоў якуюсьці акругу, заселеную палякамі, то яе ахвотна зрокся-б.

Я сугэраваў, што вартасьць нямецкай тэрыторыі была значна большая, чымсьці балот над Прыпяцьцю. Яна была індустрыяльная й Польшчы адказвала лепей. Мы хацелі мець магчымасьць сказаць палякам, што праўда на баку расейцаў, а таксама што яны, палякі, павінны згадзіцца з тым, што перад імі добры інтэрас. Калі-б паляккі не згадзіліся, мы нічога не маглі-б зарадзіць. Тут я выясьніў, што гавару толькі ад брытанцаў, дабаўляючы, што прэзыдэнт (Рузвэльт) мае шмат палякаў у ЗША, якія ёсьць ягонымі суграмадзянамі...

Сталін узноў сказаў, што калі яму давядзецца, калі якаясьці акруга будзе польскай, ён да яе ня будзе мець прэтэнсыяў.

Я сказаў, што мне гэты арбаз наагул падабаецца й што заяўлю палякам, што зь іхнага боку будзе неразумна ня прыняць прапазыцыі. Я меў-бы зазначыць ім, што для іх адведзенае прызвайтае месца пражываньня, больш чымсьці 300 міль у кажны бок.

Сталін сказаў, што гэта ўзапраўды будзе вялікая індустрыяльная краіна.

«І прыязная да Расеі», — перабіў я. Сталін адказаў, што Расея жадае прыязнай Польшчы.

Вось гэтак я, як зазначана ў запісках, сказаў Ідэну зь некаторым націскам, што ня маю намеру разьбіваць сабе галавы з за адступленьня часьці Нямеччыны Польшчы або із за Львова. Ідэн сказаў, што калі-б маршал Сталін прыняў як аснову дыскусыі лініі Кэрзона й Одры, дык гэта магло-б стаць пачаткам.

Я сказаў, што разумна было-б з боку палякаў прыняць нашую параду. Я не прыгатаўляўся падносіць галасу за Львоў. Зьвяртаючыся да маршала Сталіна, я дадаў, што ў прынцыпе між намі няма вялікіх разыходжаньняў.

Рузвэльт запытаў Сталіна, ці ён ня думаў пра магчымасьць перасяленьня насельнісцтва на прынцыпе дабравольнасьці. Маршал адказаў, што праўдападобна гэта наступіць. На гэтым мы закончылі польскую дыскусыю».

Адна душа у двух народаў

Беларусы й украінцы ў Кэмбрыдж (Ангельшчына) у першы раз сабраліся разам, каб ушанаваць Сьвяты Вечар Нараджэньня Хрыста, які, згодна Грэгарыянскага календара, прыпадаў на нядзелю 6 студзеня сёлета.

А палавіне першай гадзіны ў царкве сьвятар Беларускай Праваслаўнай Аўтакефальнай Царквы а. А. Крыт адправіў Божую Службу. А вечарам у залі, прыбранай па сьвяточнаму й удэкаравай беларускімі, украінскімі й ангельскімі нацыянальнымі сьцягамі й эмблемамі, сабралася даволі вялікая беларуска-украінская сям'я й засела за багата застаўленыя традыцыйнаю ежаю сталы.

І хоць кажнаму цісьнецца ў галаву ўспамін аб далёкай, завеенай цяпер сьнегам Бацькаўшчыне, аб сваіх найбліжэйшых, што там асталіся, хоць іх мучыць няпэўнасьць, ці ў ліку, замучаных ворагам, не знаходзіцца яго бацька, маці, брат ці сястра, аднак блішчаць запалам маладыя вочы, чуваць жарты й сьмех, льлюцца з грудзей прыгожыя каляднія песьні, якімі так багатая творчаць абодвых народаў.

Прысутныя на Куцьці прыязныя нам ангельцы цікавяцца традыцыйнымі каляднімі абрадамі нашых народаў, хоць яны тут былі паказаны далёка ня поўна. З вуснаў прамоўцаў вылівалася пэўнасьць і вера ў цудоўнае ўваскрасеньне нашых пакутных Бацькаўшчынаў, а душа кажнага была перапоўнена анельскім сьпевам — «Хвала Богу на вышынях і спакой людзям добрае волі».

Ангельская газэта «Кэмбрыдж Дэйлі Нюс» зьмясьціла фотаздымак гэтае Куцьці й кароткую зацемку, якую закончыла славамі: «Усе ўдзельнікі былі моцна ўдзячнымі за тое, што яны тут мелі магчымасьці вольна адсьвяткаваць, чаго нельга зрабіць у іхнай бацькаўшчыне».

Беларускі Работнік

ШУКАЮЦЬ

Аляксандра Савіцкага ў веку 52 гады, народжанага ў вёсцы Казіна Слонімскага павету, шукае знаёмы Тодар Барысік.

Весткі слаць на Адміністрацыю «Бацькаўшчыны».

Сяргіевіча Юльяна шукае **Сяргіевіч Васіль.** Просьба адгукнуцца на адрас: 9, rue de la Dreve, Harchies, Hainaut, Belgique.

Прадстаўніцтвы „Бацькаўшчыны"

ПАЗА НЯМЕЧЧЫНАЙ:

1. **У Бэльгіі:** Mr. Karas Leonid, 19, Place Hoover, Louvain, Belgique.
2. **У Ангельшчыне:** **The Whiteruthenian Editorial Foundation 52, Penn Road, London, N. 7. England.**
3. **У Францыі:** Mr. Symaniec Vladimir, 15, rue du Ltn. Boncour, Neuilly s/Seine, France.
4. **У ЗША:** Mr. B. Danilovich, 222 Suydam St. New Brunsvick, N. J., U. S. A.
5. **У Канадзе:** Mr. Joseph Corny, 270 Clinton Str. Toronto, Ont., Canada.
6. **У Аргентыне:** Asociacion Bielorusa en la Argentina calle Coronel Sayos 2981, 4 de Junio prov. Buenos Aires. Argentina.
7. **У Аўстраліі:** Mr. Jackievic Donat, 60 Fisher Street, East Brisbane, Q-ld, Australia.
8. **У Вэнэцуэлі:** Dudzickj Vladimir, Crucesita a San Miquel 74, Caracas, Venezuela.
9. **У Новай Зэляндыі:** Mr. Karanieuskj Marjan, Burns Izonse, Mosgiel, New Zeeland.

Непастрэдна з гэтых прадстаўніцтваў просім суродзічаў выпісваць «Бацькаўшчыну» і там-жа разьлічвацца за газэту.

ЦАНА «БАЦЬКАЎШЧЫНЫ ПАЗА НЯМЕЧЧЫНАЙ

1. ЗША	15 цэнтаў
2. Канада	15 цэнтаў
3. Вялікабрытанія	1 шылінг
4. Францыя	40 франкаў
5. Аўстралія	1 шылінг
6. Аргентына	2 пэзо.
7. Бэльгія	5 франкаў

Ува усіх іншых краінах раўнавартасьць 15 цэнтаў ЗША за 1 эгзэмпляр.

З прычыны дэвізовых абмежаваньняў у Нямеччыне грошы за «Бацькаўшчыну» з усіх краінаў паза Нямеччынай просім перасылаць на наступны адрас: Mr. Jan Zaprudnik, 19, Place Hoover, Louvain, Belgique.

Артыкулы, падпісаныя прозьвішчамі або ініцыяламі аўтараў, могуць выражаць думкі, зь якімі Рэдакцыя не згаджаецца.

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011